

# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я.КУПАЛЫ

№ 7 (235) 5 чэрвеня 1996 года, серада

## БУДЗЕ ІНАВАЦЫЙНЫ ЦЭНТР

*Навуцы ніколі не было лёгка рэалізавацца на практыцы. Працэс гэты рухаўся няспешна, расцягваўся на гады і, здаралася, навуковая распрацоўка губляла на цярністым шляху сваю першапачатковую актуальнасць.*

*Вопыт развітых краін Еўропы сведчыць, што стварэнне так званых тэхнапаркавых інавацыйных структур значна скарачае прамежак часу ад распрацоўкі да ўкаранення ў вытворчасць. Акрамя таго, стварэнне навукова-тэхналагічных паркаў дазваляе станоўча вырашаць і складаныя рэгіянальныя праблемы: захаванне інтэлектуальнага патэнцыялу, стварэнне новых працоўных месцаў для інжынераў і навукоўцаў, забяспечвае хутчэйшы выхад на знешні рынак гатовай высокатэхналагічнай прадукцыі і г.д.*

*У гэтыя дні калектыў Гродзенскага дзяржуніверсітэта сумесна з аддзелам праблем рэсурсазберажэння АН РБ плённа працуе над стварэннем першага ў вобласці бізнес-інавацыйнага цэнтра. Створана ініцыятыўная група, якая рыхтуе неабходныя нарматыўныя дакументы, збірае інавацыйныя ідэі, шукае прыдатнае памяшканне. Вырашаюцца і ўзгадняюцца арганізацыйныя пытанні.*

*У гутарцы з карэспандэнтам начальнік навукова-даследчага сектара універсітэта **В.В. Сянько** зазначыў:*

- У стварэнні інавацыйнага цэнтра маем падтрымку камітэта па навуцы і тэхналогіях Міністэрства адукацыі і навукі рэспублікі.

Мяркуем, што да восені ўжо рэальна паўстане неабходнасць падбору ўдзельнікаў новых структур, а інавацыйны цэнтр будзе ствараецца ў выглядзе акцыянернага таварыства, у якім змогуць прыняць удзел усе навуковыя ўстановы і вну Гродна.

- *Што ж падштурхнула навукоўцаў з універсітэта шукаць новыя формы працы? - задаю пытанне Васілю Васільевічу.*

- Мы вывучылі замежны вопыт, - *быў адказ,* - і прыйшлі да высновы, што малы навукова-інавацыйны бізнес найбольш дынамічны, прыстасаваны да рэальных умоў і канкурэнтаздольны. У той час, як існуючая ў нашай рэспубліцы сістэма стварэння і ўкаранення навуковых распрацовак стала ўжо малаэфектыўнай. Асабліва слабым звяном у ланцугу "навука - вытворчасць" з'явілася тое, якое павінна займацца асваеннем фундаментальных даследаванняў і выпускам сучаснай прадукцыі. Мы мяркуем, што стварэнне бізнес-інавацыйнага цэнтра адчыняе рэальную магчымасць у кароткія тэрміны і з найменшымі затратамі арганізаваць дробнасерыйную вытворчасць электронікі, оптыкі, медыцынскіх прэпаратаў для сельскай гаспадаркі, новых матэрыялаў на базе сучасных тэхналогій. Тут знойдуць шырокае прымяненне, у першую чаргу, грунтоўныя распрацоўкі фізіка-тэхнічнага і біёлага-экалагічнага факультэтаў універсітэта. І, як падкрэсліў В.В.Сянько, у бізнес-інавацыйным цэнтры будуць разглядацца ўсе слушныя прапановы, цікавыя і нестандартныя ідэі, запрашаюцца да супрацоўніцтва творчыя людзі, здольныя спалучаць у сабе імкненне да пошуку і карпатлівую вытворчую працу.

*С. БЕРАСТ.*

## Супрацоўніцтва: Гродна - Беласток

У канцы мая наш універсітэт наведала дэлегацыя Вышэйшай школы фінансаў і ўпраўлення з горада Беластока. Рэктар школы Юзэф Шаблоўскі і прафесар Станіслаў Костка вялі размову аб супрацоўніцтве. Вынікам сустрэчы стала падпісанне дагавору аб абмене вопытам навучання і падрыхтоўкі спецыялістаў, аб правядзенні сумесных навукова-даследчых прац па актуальных праблемах навукі і тэхнікі. Абодва бакі маюць намер падтрымліваць ініцыятывы ў галіне развіцця і ўкаранення новых інфармацыйных тэхналогій.

Мяркуецца, што рэгулярным стане абмен навукова-педагагічнымі работнікамі і студэнтамі. Ужо ў бліжэйшы час з узаемным візітам у Беласток паедзе дэлегацыя нашага універсітэта.

*Л. ЯРУНЦАВА,*
*супрацоўнік аддзела замежных сувязяў.*

## СУСТРЭНЕМСЯ Ў ВЕРАСНІ

Завяршаецца яшчэ адзін навучальны год. Усё было: радасць поспехаў і перамог, горыч няўдач і трывог. Кожны з нас - і выкладчыкі, і супрацоўнікі, і студэнты адчулі на сабе цяжар фінансавага дэфіцыту. Нялёгка прыйшлося і нашай маленькай газеце. Не было грошай плаціць за работу абласной друкарні - асвоілі друкаванне газеты ў выдавецкім аддзеле. Цяпер яна выходзіць рэгулярна, у першыя дні месяца, аднак недасканаласць тэхнікі не лепшым чынам уплывае на якасць...

Вельмі шкада, што газета універсітэта выходзіць толькі адзін раз у месяц. Шмат якія падзеі універсітэцкага жыцця застаюцца без асвятлення або страчваюць сваю актуальнасць. Але каб змяніць перыядычнасць і выпускаць "Гродзенскі універсітэт" часцей, патрэбны людзі, у прыватнасці, на пасаду карэспандэнта. А для гэтага, зноў жа, патрэбны грошы. Мяркую, што, можа, у новым навучальным годзе трохі большым будзе тыраж нашай газеты. І тады яе ўбачаць і нашыя студэнты. Бо, нажаль, да студэнцтва яна не даходзіць. Тыя некалькі соцен экземпляраў, што друкуюцца, даходзяць толькі адзінкамі на факультэты і кафедры. Мабыць, каб чыталі студэнты газету, дык супрацоўнічалі б з ёй. Няцяжка заўважыць, што студэнцкае жыццё, студэнцкая творчасць і, нарэшце, студэнцкі гумар - рэдкія "госці" на старонках газеты. Ад гэтага губляецца і яе прызначэнне, і яе прэстыж. Запрашаю ўсіх студэнтаў, якім ёсць што сказаць, якія хочуць і могуць гэта зрабіць, пісаць у газету, асвятляючы розныя бакі студэнцкага жыцця; напаўняць змест допісаў творчым узлётам, такім характэрным для моладзі, аздабляць нашы старонкі цікавымі знаходкамі, паэзіяй, гумарам. Іх так не хапае газеце універсітэта!

Зазірнуўшы ў недалёкую перспектыву, мяркую, што пачынаючы з верасня, штомесяц будзем рыхтаваць падборкі матэрыялаў з факультэтаў. З усіх факультэтаў. Будзем разам з дэканатамі, супрацоўнікамі, студэнтамі шукаць найбольш адметнае, цікавае, што ёсць у жыцці факультэтаў і такім чынам ствараць нешта накшталт "летапісу". Увогуле ж атрымаецца малюнак універсітэцкага жыцця ў цэлым.

Вельмі пажадана было б, каб нашы выкладчыкі, супрацоўнікі, студэнты давяралі нам свае "творчыя ўзлёты" - у вершах, замалёўках, фотаздымках, малюнках. Не сумняваюся, шмат у каго ёсць такія захапленні. Калі самі сароммеецеся - няхай вашы калегі раскажуць нам (і пакажуць!) вашы набыткі.

Давайце паглядзім на сябе і сваіх калег трохі іначай, убачым іх у іншым свеце. Газета заўсёды дапаможа ў гэтым.

Лета - час канікул і водпускаў. Будзе магчымасць зрабіць здымкі - прынясіце іх да нас у рэдакцыю. Нам так не хапае фотаздымкаў! Адным словам, не забывайцеся, калі ласка, што ва універсітэце існуе газета, якая чакае ад кожнага падтрымкі і ўдзелу.

Сонечнага і радаснага ўсім лета! Добрага адпачынку і бадзёрага настрою да працы ў новым навучальным годзе!

*Святлана МУРЫНА,*
*рэдактар газеты*
*"Гродзенскі універсітэт".*

Першае выданне гэтай змястоўнай і цікавай кнігі ўбачыла свет летась, падчас 50-годдзя Вялікай Перамогі. Сёлета, незадоўга да святкавання чарговай гадавіны Перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі выйшла другое, выпраўленае і дапоўненае выданне кнігі-летапісу "Гродна ў гады Вялікай Айчыннай вайны 1941-1945 г.".

Кожны раздзел гэтай вялікай працы нараджаўся ў нашым універсітэце. Аўтарскі калектыў - добра вядомыя гісторыкі І.П. Крэнь (кіраўнік), Л.У. Бярэйшык, М.В. Васілючак, Б.М. Іванчук, В.В. Калюта, І.І. Коўкель, У.А.Нядзелька, С.В. Палуцкая, Н.У. Паўлючэнка, М.Я. Саваняка, В.М. Царук, У.Я. Ягорычаў, Э.С. Ярмусік.

# КНІГА ПАМЯЦІ — НА НАШЫМ СТАЛЕ

Не абмяжоўваючыся ваеннай тэмай, аўтары далі чытачу даволі поўнае ўяўленне пра гісторыю нашага горада, пачынаючы з XII стагоддзя, ад тых сівых гадоў, калі гарадзенская крэпасць перараўтварылася ў княжацкую рэзідэнцыю і на беразе Нёмана пачаў расці горад, які памятае яшчэ моц нашчадкаў Яраслава Мудрага. Раздзел "Гродна-старажытны беларускі горад" уключае падзеі ад X - XII стагоддзяў да пачатку Вялікай Айчыннай вайны. На некалькіх дзесятках старонак - прозвішчы, прозвішчы, прозвішчы. Сярод іх - і нашы калегі, проста знаёмыя, родныя, блізкія людзі. Гэта - спіс гродзенцаў, удзельнікаў Вялікай Айчыннай, якія выйшлі пераможцамі ў той жудаснай вайне.

Асобныя раздзелы кнігі - "Абарончыя баі ў раёне Гродна ў чэрвені 1941г.", "Акупацыйны рэжым у Гродне", "Горад змагаецца", "Вызваленне Гродна". У іх сабраны гістарычныя даведкі, архіўныя дакументы, успаміны ўдзельнікаў вайны, відавочцаў тых падзей. Матэрыялы сведчаць: Гродна не скарыўся пад гнётам фашысцкага зняволення. У горадзе дзейнічалі падпольныя антыфашысцкія групы, у ваколіцах - партызаны. 16 ліпеня 44-га, у 23 гадзіны, Масква салютавала дваццацю артылерыйскімі залпамі ў гонар вызвалення Гродна. За яго заплочана дарага. Тысячы чалавечых жыццяў каштавала гэта перамога. У кнізе - спісы воінаў Чырвонай Арміі, якія загінулі або прапалі без вестак у чэрвені 41-га, спісы ўдзельнікаў антыфашысцкага падполля і мірных жыхароў Гродна, што загінулі ў перыяд акупацыі горада, воінаў-землякоў, якія загінулі ці прапалі без весткі на розных франтах і пры вызваленні Гродна.

Гродна пасляваеннага перыяду, яго развіццё і росквіт падрабязна акрэслены ў завяршальным нарысе, які, як і папярэднія, багата ілюстраваны.

Названая кніга - не толькі выдатны падарунак ветэранам да гадавіны Перамогі. Яна - цудоўны дапаможнік для гісторыкаў, краязнаўцаў, студэнтаў, школьнікаў.

*С. МУРЫНА.*

# КИОСК: БЫТЬ ИЛИ НЕ БЫТЬ?



*Второй год работает в университете книжный киоск, единственный в своем роде, вузовский, с широким ассортиментом учебной и методической литературы, выпущенной в дальнем и ближнем зарубежье, в нашей республике, в частности, в Гродненском университете. Отлаженные контакты с издательствами, а их - разветвленная сеть, помогают обеспечивать учебно-методический процесс необходимой литературой. Причем, и цены здесь ниже, чем в других книжных магазинах. Да и ходить в другие магазины нет необходимости. Казалось бы, удобно и выгодно под одной крышей и киоску, и университету. Но в последнее время, когда стали очевидными проблемы с реализацией изданной у нас литературы, прошел слух, будто бы университет хочет отказаться от услуг киоска. И зазвенел телефон в редакции "Гродненского университета". Вот несколько мнений на этот счет.*

***Т.А. Бадюкова,** заведующая учебно-методическим отделом:*

- Бесспорно, книжный киоск у самого входа в университет - благо и для студентов, и для преподавателей. Здесь много необходимого для работы и учебы. Киоск - это самый короткий и наименее хлопотный путь от издателя до потребителя. Но... головной болью в последнее время стала литература, изданная в университете. Существуют известные сложности в ее реализации. И в этом вина не только работников киоска. Впрочем, и они могли бы активнее искать рынки сбыта нашей учебно-методической литературы, рекламируя и реализуя ее в других вузах. Может быть, тиражи наших изданий делать меньше, с учетом спроса? Вижу выход и в усилении ответственности авторов за ее реализацию.

***С.В. Кондратьева,** зав. кафедрой психологии:*

- Не знаю экономических расчетов, не знаю, какой ущерб несет университет от аренды помещения. Может, у нашего руководства имеются возможности наладить дело лучше, но лично я и многие мои коллеги не представляют свою работу без киоска Д. Баранова, который специализируется на поставке психологической литературы, оперативно обеспечивая нас самой первоклассной - отечественной и переводной. Могу сравнить киоск с блокадною "дорогою жизни", он - единственный источник, который нас связывает с психологической культурой всего мира. Кстати, работая по заказам нашего факультета, Д. Баранов делает скидки на 15-20 процентов стоимости.

***Т.Е. Автухович,** доцент кафедры русской и зарубежной литературы:*

- Еще в прежние (до распада СССР) времена централизованной книготорговли мне казалось странным, что в ГрГУ нет своего книжного киоска. Бывая на научных конференциях в Москве, Ленинграде, Днепропетровске и других городах, видя толпящихся возле книжных прилавков преподавателей и студентов, я с некоторой долей зависти думала о том, что университетский тон создается не в последнюю очередь и благодаря этим книжным богатствам, выставленным прямо в факультетских коридорах. Ведь преподаватель и книга, студент и книга (тем более - новая книга) - это неразделимо.

Поэтому, когда у нас появился свой книжный киоск, первая реакция была: "Наконец-то!" Думалось, что это очередной и необходимый шаг к созданию Университета (ибо совершенно очевидно, что статус вуза не изменяется автоматически со сменой вывески).

Оценила и другое: на фоне торжества бульварного книгопотока в городских книжных магазинах наш киоск был оазисом духовности: специальные научные издания, кассеты с хорошей классической музыкой... Причем, ничто не залеживалось на прилавках.

Мне кажется, что университет может и должен поддержать столь редкий в наше время альтруизм Д. Баранова, ибо иначе как альтруизмом его деятельность не назовешь: понятно, что проще и прибыльнее было бы ему заниматься сбытом коммерческой литературы. Но с чем мы тогда останемся? Наедине со своей провинциальной "простотой?" Но будем ли мы тогда Университетом?!.

***Канферэнцыі***

# ПЕРЫЁДЫЦЫ ГРОДЗЕНШЧЫНЫ - 220 ГАДОЎ

Журналісты, культработнікі, супрацоўнікі бібліятэк горада сталі ў маі ўдзельнікамі цікавай і надзвычай змястоўнай навукова-практычнай канферэнцыі, тэма якой гаворыць сама за сябе: "Перыядычны друк Гродзеншчыны: станаўленне, развіццё, сучаснасць". Прысвячалася канферэнцыя 220-годдзю з дня выдання першай газеты ў нашым рэгіёне - "Газеты Гродзеньскай". Удзел у падрыхтоўцы мерапрыемства прымалі і супрацоўнікі нашага універсітэта.

Уступнае слова сказаў начальнік упраўлення культуры і інфармацыі аблвыканкама В.І. Брыкач. Пра "Газету Гродзеньску" - першае перыядычнае выданне на Беларусі расказаў кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт універсітэта А.У. Мілінкевіч. Пра гістарычны лёс "Гродзенскіх епархіяльных ведамасцяў" (1901-1996 г.) гаварыў прафесар, загадчык кафедры гісторыі славянскіх дзяржаў нашага універсітэта В.М. Чарапіца. Пра "Гродзенскія губернскія ведамасці" (1839-1917 г.) як крыніцу гісторыі краю, пра перыядычны друк Гродзеншчыны ў перыяд з 1890 па 1939 гады расказвалі археограф Л.В. Паршына, навуковыя супрацоўнікі гісторыка-археалагічнага музея А.І.Саўчук і І.І. Юхно.

Перад прысутнымі выступілі таксама адказны сакратар "Гродзенскай праўды" М.В. Шлык, намеснік начальніка ўпраўлення культуры і інфармацыі аблвыканкама У.П. Амелька, загадчык аддзела перыядычных выданняў абласной бібліятэкі Н.М. Мілоста.

***Для даведкі.** Зараз у абласной бібліятэцы маецца 400 найменаванняў перыядычных выданняў розных часоў, сярод іх - рукапісныя газеты і часопісы.*

*У вобласці зараз выдаецца 39 перыядычных выданняў. "На падыходзе" - новы дадатак да абласной газеты - "Вячэрні*



*Как уже сообщалось, 10-летию чернобыльской трагедии была посвящена научно-практическая конференция. Одним из содержательнейших на ней был доклад С. Маглыш. Публикуем его с сокращениями.*

# РАДИАЦИЯ: ДОЗЫ И ПОСЛЕДСТВИЯ

В чем выражается биологический эффект действия радиации? Радиация по самой своей природе вредна для жизни. Опасность ее многократно усиливается тем, что она не имеет ни цвета, ни вкуса, ни запаха. Человек ничего не ощущает, а поэтому не может предотвратить ее воздействие. О дозе облучения можно судить по результатам дозиметрического контроля и по величине биологических нарушений в организме. Поглощенная доза измеряется в грэях (количество энергии на единицу массы тела). Малые дозы облучения могут "запустить" не до конца еще установленную цепь событий, приводящих к раку или генетическим повреждениям. При больших дозах радиация может разрушить клетки, повреждать ткани и органы и явиться причиной скорой гибели организма.

Повреждения, вызываемые большими дозами, обыкновенно проявляются в течение нескольких часов или дней. Раковые заболевания, однако, проявляются спустя много лет. Врожденные пороки развития и другие наследственные болезни проявляются лишь в следующем или последующих поколениях: это дети, внуки и более отдаленные потомки.

В то время как идентификация "острых" последствий от действия больших доз облучения не составляет труда, обнаружить отдаленные последствия от малых доз облучения всегда оказывается очень трудно. Частично это объясняется тем, что для их проявления должно пройти очень много времени. Но даже и обнаружив какие-то эффекты, требуется еще доказать, что они объясняются радиацией, поскольку и рак, и повреждения генет..ческого аппарата могут быть вызваны и множеством других причин.

При больших дозах облучения происходит острое поражение организма человека. Однако реакция разных органов и тканей неодинакова при одной и той же дозе, причем, различия эти очень велики. Величина же дозы, определяющая тяжесть поражения организма, зависит от того, получает ли он ее сразу, или в несколько приемов. Большинство органов легче переносит серию мелких доз, нежели ту же дозу суммарного облучения за один прием. Если доза облучения достаточно велика, облученный человек погибает очень быстро. При дозе облучения порядка 100 грэй смерть, как правило, наступает в течение нескольких часов или дней из-за серьезного поражения центральной нервной системы. При дозах облучения от 10 до 50 грэй поражение центральной нервной системы не приводит сразу к летальному исходу, однако человек все равно умирает через 1-2 недели от кровоизлияний в желудочно-кишечном тракте. При еще меньших дозах организм может справиться с повреждениями желудочно-кишечного тракта, однако смерть наступает через 1-2 месяца из-за разрушения клеток красного костного мозга. От дозы 3-5 грэй при облучении всего тела умирает примерно половина всех облученных. Костный мозг наиболее уязвим и теряет способность нормально функционировать уже при дозе 0,5-1 грэй. К счастью, он обладает способностью к регенерации и при небольших дозах может полностью восстановить свои функции. Репродуктивные органы и глаза также проявляют повышенную чувствительность к облучению. Однократное облучение семенников дозой 0,1 грэй приводит к временной стерильности, а при дозе больше 2 грэй - к постоянной стериальности. Доза, полученная в несколько приемов для них более опасна, чем та же доза, полученная за один прием. Яичники менее чувствительны к действию радиации, однако при дозе больше 3 грэй наступает их стерильность. В глазу наиболее чувствителен к радиации хрусталик. При дозе 2 грэя появляются помутневшие участки хрусталика, при дозе 5 грэй наблюдается прогрессирующая катаракта, которая ведет затем к полной слепоте. Чем больше доза, тем быстрее наступает потеря зрения. Дети крайне чувствительны к действию радиации. Суммарная доза в 10 грэй достаточна, чтобы вызвать некоторые аномалии развития скелета, остановить рост костей, привести к слабоумию. По-видимому, для такого действия радиации не существует никакого порогового эффекта. Кости и мозг взрослого человека способны выдержать гораздо большие дозы. Большинство тканей взрослого человека относительно мало чувствительны к действию радиации. Почки выдерживают суммарную дозу 20 грэй в месяц без особого для себя вреда, печень - 40 грэй, мочевой пузырь - 55 грэй, хрящевая ткань - до 70 грай в месяц.

Каковы же последствия малых доз облучения? Они более характерны для жителей Беларуси после чернобыльской аварии. Рак - наиболее серьезное из всех последствий облучения человека при малых дозах радиации. Согласно имеющимся данным, первыми в группе раковых заболеваний, поражающих население в результате облучения, стоят лейкозы. Они вызывают гибель людей в среднем через 10 лет с момента облучения - гораздо раньше других видов раковых заболеваний. Согласно оценкам Научного комитета по действию атомной радиации при ООН от каждой дозы облучения в 1 грэй в среднем 2 человека из тысячи умирают от лейкозов. Самыми распространенными видами рака, вызванными действием радиации, оказались рак щитовидной железы и рак молочной железы. Примерно у 10 человек из 1000 облученных отмечается рак щитовидной железы, а у 10 женщин из 1000 - рак молочной железы в расчете на 1 грэй индивидуальной поглощенной дозы. Однако обе разновидности рака в принципе излечимы,а смертность от рака щитовидной железы особенно низка. Рак легких, напротив, беспощадный убийца. Он также принадлежит к распространенным разновидностям раковых заболеваний (5 человек из 1000). Рак других органов и тканей, как оказалось, встречается среди облученных групп населения реже. Согласно оценкам Научного комитета по действию атомной радиации при ООН, вероятность умереть от рака желудка, печени или толстой кишки составляет примерно 1:1000 на каждый грэй средней индивидуальной дозы облучения. А риск возникновения рака костных тканей, пищевода, тонкой кишки, мочевого пузыря, поджелудочной железы, прямой кишки и лимфатических тканей еще меньше и составляет от 0,2 до 0,5 на каждую 1000 облученных. Дети более чувствительны к облучению, чем взрослые, а при облучении плода риск заболевания раком, по-видимому, еще больше. Радиация может в принципе оказывать действие на разные химические и биологические агенты, что может приводить в ряде случаев к дополнительному увеличению частоты заболевания раком. В настоящее время получены серьезные доказательства этого относительно табачного дыма. Представление, что облучение ускоряет процесс старения, не имеет достаточно убедительных доказательств.

Изучение генетических последствий облучения связано с еще большими трудностями, чем в случае рака. Во-первых, очень мало известно о том, какие повреждения возникают в генетическом аппарате при облучении, во-вторых, полное выявление всех наследственных дефектов происходит лишь на протяжении многих поколений, и в-третьих, как и в случае рака, эти дефекты невозможно отличить от тех, которые возникли по другим причинам. Около 10% всех живых новорожденных имеют те или иные генетические дефекты развития, и вероятность для них дожить до своего первого дня рождения в 5 раз меньше, чем для нормальных детей. Согласно полученным экспериментальным данным на животных, доза в 1 грэй индуцирует у особей мужского пола появление от 30 до 1000 хромосомных нарушений и от 1000 до 2000 генных мутаций на каждый миллион живых новорожденных. У женских особей эти цифры ниже, так как женские половые клетки менее чувствительны к действию радиации. В итоге примерно 15000 живых новорожденных из каждого миллиона будут рождаться с серьезными наследственными дефектами из-за такого радиационного фона.

***С.МАГЛЫШ,***
***доцент кафедры биохимии, кандидат биологических наук.***

# ДЕНЬ ЗДОРОВЬЯ

Каждую субботу мая в республике будет отмечаться праздник - День физической культуры и спорта, а по решению ректората университета 18 мая был проведен общевузовский праздник - День здоровья.

На университетском стадионе, спортивном манеже и в спортивных залах шли соревнования студентов, преподавателей и сотрудников вуза.

Первыми на беговые дорожки стадиона вышли команды факультетов - девушек и юношей, которые соревновались в эстафетном беге 10 х 400 метров. Уверенно победили команды факультета физической культуры.

После предварительных поединков в финал по мини-футболу вышли две команды физико-технического факультета. Увлекательный поединок завершился победой первой команды. Счет 5:4.

У волейболистов сильнейшей была команда физико-технического факультета (капитан команды В. Паняшин.)

Много зрителей собрали соревнования по спортландии. Участвовали четыре команды (исторического, физико-технического, математического факультетов и факультета права и экономики). В каждом конкурсе шла упорная борьба. Попеременно лидировали каждая команда, и только последний конкурс - "комбинированная эстафета" - выявил победителей. Победу праздновали "физтеховцы".

На баскетбольной площадке у юношей лучшей была объединенная команда, куда входили студенты-правоведы, физики, историки и математики.

В беге на милю (1,6 км) у девушек победили Оксана Моисеенко, у юношей - Сергей Янкович (факультет физической культуры). Дмитрий Новиков (матфак) - лучший шахматист праздника.

Больше всех - двадцать один раз подтянулся Дима Леменовский (физтех), отжалась в упоре лежа (двадцать пять раз) Елена Хомутова. Двадцать пять раз поднял гирю над головой Михаил Живолович (физическая культура). Второй приз Михаил получил за победу в армрестлинге.

Праздник молодости, здоровья, красоты, силы удался, и погода благоприятствовала празднику. Оргкомитет Дня здоровья выражает благодарность всем принявшим участие в этом празднике, желает всем студентам и преподавателям вуза доброго здоровья, счастья, благополучия и новых успехов в физической культуре, спорте, туризме.

***О.СМОЛЯКОВ,***
***ст. преподаватель кафедры физвоспитания.***

*Далёкае-блізкае*



# ГУБНЫ ГАРМОНІК

Гэты музычны інструмент зараз амаль што забыты. Зрэдку, на аглядах мастацкай самадзейнасці, сталы чалавек, мабыць, і выканае адну-дзве мелодыі. Нязвыклыя яны ў параўнанні з магутным гучаннем сучаснага інструмента. Не іграюць на губных гармоніках і малыя дзеці, зараз у іх - аудыё- ды электронныя музычныя гульні. У маім дзяцінстве губны гармонік быў марай кожнага хлопчыка, атрымаўшы яго ў падарунак, не было шчаслівейшага дзіцяці...

Асабіста для мяне губны гармонік - гэта яркі ўспамін пра вайну, мая "зброя" ў партызанскай зоне. Я з бацькамі ў той час жыў у Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці. У тых мясцінах дзейнічаў партызанскі атрад імя Катоўскага. І наша сям'я была партызанскай. Жывучы на хутары, выконваючы звыклую сялянскую працу, нічым не прыцягваючы ўвагі суседзяў і паліцаяў, мае бацькі цесную сувязь падтрымлівалі з партызанамі. Да нас заходзілі разведчыкі з атрада. Аб чым яны размаўлялі з бацькамі, нам, дзецям, было невядома, хоць усё мы добра разумелі і сябрукам нічога не расказвалі.

Мой бацька быў столярам. Для партызанскіх вінтовак і аўтаматаў рабіў прыклады, а таксама сёдлы, іншыя рэчы. Час ад часу мне даводзілася выконваць ролю сувязнога разведгрупы. А аднойчы адзін партызан падарыў мне губны гармонік, трафейны нямецкі гармонік - гучны, галасісты, далікатны. Аб такім падарунку я мог толькі марыць. Такую прыгажосць у руках ніколі не трымаў. А вось дзядзька мой умеў добра іграць на губным гармоніку, і ён стаў маім настаўнікам у авалоданні майстэрствам выканання. Праз некалькі тыдняў пад мой гармонік можна было ўжо ладзіць танцы. Партызан, што падарыў мне гармонік, пачуўшы тое-сёе з майго рэпертуару, вельмі здзівіўся, бо ў яго так ладна не атрымлівалася...

Партызанскае жыццё - гэта не толькі засады, перастрэлкі, узрывы на чыгунках. Партызаны - гэта, у большасці сваёй - маладыя хлопцы, мясцовыя жыхары. І ім хацелася час ад часу адпачыць і павесяліцца, патанцаваць з дзяўчатамі. Я быў у іх - галоўны музыка, мой інструмент заўсёды ляжаў у кішэні, заўсёды напагатове, каб зайграць хуткую "полечку" ці павольны вальс. Вясковая моладзь, калі ладзіліся вечарыны, таксама запрашала мяне пайграць.

Часта па даручэнню партызан мне прыходзілася ездзіць у Кобрын. Тады я абавязкова браў з сабою гармонік. Для таго, каб мець сабе "алібі". Напрыклад, затрымае паліцэйскі кантроль пры выездзе з горада, дык я паказваю гармонік і тлумачу, што прыязджаў купіць яго ў нямецкіх салдат. А ў час вайны амаль кожны з іх меў пры сабе губны гармонік і ўмеў іграць.

8 мая гэтага года, калі сабраліся на вечарыну нашы, універсітэцкія, ветэраны вайны і працы, я выканаў перад імі тры мелодыі на губным гармоніку. Не на тым, праўда, што з ваенных гадоў, а на новым. А ўспамін пераносіў мяне далёка-далёка, у тыя суровыя ваенныя часіны, якія дапамог мне перадолець трафейны нямецкі губны гармонік...

***Р. КУРЫШКА,***
***дацэнт кафедры нямецкай мовы.***

*Окно в природу*

# ШУТКИ ОГОРОДНИКА

Кто не любит остроумной шутки, озорного, веселого, безобидного розыгрыша! На что уж ученые-физики строгие люди, но и они неравнодушны к этому жанру. С каждым переизданием, например, пополняется новыми страницами книга "Физики шутят", периодически выпускаемая издательством "Мир".

Но, как выяснилось, любят шутить не хуже физиков и огородники. Правда, по-своему, пособому. Ну, например, приглашает огородник к себе гостей. И пока накрывается стол, хозяин достает из серванта бутылку, а в ней... огурец, да такого крупного калибра, что у гостей единодушно вырывается "ах", а на лицах вопрос: как он туда попал?

Всем ясно, что через узкое горлышко такой упитанный плод без посторонней помощи никак не мог проникнуть. Тут и начинаются догадки. Осмотрена бутылка, не приклеено ли донышко - нет, не похоже. Кто-то высказал предположение, что огурец держали в каком-то специальном растворе, он размягчился до консистенции холодца и в таком состоянии ничего не стоило его заточить в бутылку. Раствор испарился и плод обрел свое изначальное состояние. Были и другие, не менее остроумные решения вопроса. И когда возможные варианты иссякли, гости хором попросили хозяина открыть секрет.

Тот еще малость понаслаждался наивностью догадок гостей и поведал, как это все просто делается. На грядке, где растут огурцы, в притененном месте кладется обычная бутылка. В нее засовывается огуречная завязь. Там в бутылке плод и растет. А когда он созреет, плеть отделяют, в бутылку наливают соленую воду и хорошо закупоривают...

Гости смущенно переглядываются, им немножко неловко за свою недогадливость, а хозяин, шутник-огородник, торжествует.

Или под Новый год.

... Куранты бьют двенадцать, гости идут к столу. И тут они останавливаются пораженные; в большой хрустальной вазе возвышается целая гора свежих, упругих, таких ароматных огурцов, что глаз не отвести.

Конечно, восторги, изумление, вопросы: откуда взялось такое чудо, не из овощного магазина ведь. Огородник уже не смеет томить своих гостей неизвестностью и рассказывает, как все это делается.

На огороде в грядках между капустой высаживается и огурец. Когда начинают завязываться вилки капусты, туда осторожно помещается и маленький огурчик. От плети он, конечно, не отделяется. Растет кочан капусты, а в его чреве растет и огурец. И когда приходит пора, капусту вырывают с корнем, подвешивают в прохладном погребе, где этот симбиоз и дожидается своего часа.

Много в запасе у шутника-огородника выдумок. У него на огороде растут на картофеле помидоры, из низко срезанного стебля осота стремится к солнцу укроп...

Есть шутники и среди картофелеводов. Например, в середине мая такой шутник что-то старательно выкапывает на своем огороде. Присмотрелись соседи - да это же самый настоящий картофель! Как, в мае?!

Не прерывая работы, огородник поведал, что это не так уж сложно - посадить в августе картофель старыми клубнями, хорошо ухаживать за растениями, а осенью, когда начинаются заморозки, срезать ботву, участок покрыть навозом или торфом слоем в 8 - 10 сантиметров, зимой больше набросать снегу и ждать весны. Так можно иметь майский урожай клубней.

***Н. ВАСИЛЬЕВ.***

# У НАС В ГОСТЯХ

## юмористическая газета "ПИКНИК"



*Уважаемые читатели!*

*Вспомните, сколько сегодня развелось любителей испортить ваше настроение - диктор телевидения с улыбкой сообщающий об очередном повышении цен на колбасу и плату за проезд, лучшая подруга, пытающаяся совратить вашего мужа, неугомонный сосед, пристающий с вопросом: “Когда вернете долг?”... Приятное исключение - веселая газета “Пикник”, приложение к известной “Детективной газете”, ежемесячное издание без политики. “Пикник” молод, но стабилен, а главное - совсем недорогой - за 18 тысяч рублей можно подписаться аж на полгода. На 12 страницах газеты, над выпуском которой трудятся лучшие юмористические силы Беларуси и ближнего зарубежья: карикатуры, анекдоты, басни, самые разнообразные конкурсы (с крупными оригинальными призами, между прочим!), детский “Пятачок”, кроссворды, популярные песни, невероятно смешные истории.*

*Однако газету делают не только профессионалы. Большую помощь оказывают нам и читатели, которые и в наше смутное время не потеряли чувства юмора. И если у вас есть смешная история, карикатура, фотография, анекдот, мы ждем ваших писем.*

*Шеф-редактор газеты “Пикник”* ***Анатолий Гармаза.***












После пяти лет счастливого брака жена говорит мужу:

- Хочу тебе кое в чем признаться, дорогой. Я дальтоник.

- И я тебе тоже хочу признаться, дорогая. Я негр.

* * *

- Иван! Помоги грузчику перенести шкаф.

- Что я - носильщик?

- Как СПИД в дом носить - так ты носильщик!...

* * *

- Ты слышал, Коля поссорился со своей женой!

- И что же они не поделили?

- Он купил подержанную надгробную плиту и потребовал, чтобы жена сменила имя.

* * *

Прыгает первый раз Абрам с парашютом. Сара с Додиком пошли посмотреть. Все приземлились, ходят, а Абрам лежит без чувств.

- Додик, сходи посмотри, дышит ли папа?

Додик возвращается:

- Папа-то наш дышит, а вокруг дышать нечем.

*Рэдактар*
С. МУРЫНА
Карэктура
Н.ДУДКО
*Камп'ютарная вёрстка*
Ю.РАДСА
*Камп'ютарны набор*
М.ВЕРСТАК

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытатаў, эканамічных даных, асабістых імёнаў, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.

*Наш адрас:* *230023, г.Гродна, вул. Ажэшкі, 22, пакой 404.*
☎ *44-72-97*

Газета выходзіць адзін раз у месяц.
Аб'ём - 1 друк. арк.

*Здадзена ў набор 24.05.96 г.*
*Заказ 44*
*Наклад 500 асобнікаў.*

Газета набрана, звярстана і аддрукавана на тэхніцы выдавецкага аддзела Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я.Купалы.
Рэгістрацыйнае пасведчанне №421.

*Заснавальнікі: Вучоны Савет універсітэта, прафкам супрацоўнікаў, прафкам студэнтаў.*